*Гужаловский А. А.* **Сексуальная революция в Советской Беларуси: 1917–1929 гг.** Минск : А. М. Янушкевич, 2017. 258 с.

*Гужалоўскі А. А.* **Сексуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917–1929 гг.** Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. 258 с.

*Huzhalouski A. A.* **The sexual revolution in the Soviet Belarus: 1917–1929.** Minsk : A. M. Janushkevich, 2017. 258 p.

Выхад кнігі доктара гістарычных навук прафесара А. А. Гужалоўскага «Сексуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917–1929 гг.» суправаджаўся зацікаўленай, хаця і неадназначнай рэакцыяй калег-гісторыкаў і кідкімі, разлічанымі на сенсацыйнасць, загалоўкамі ў інтэрнэце. Чаго вартыя, напрыклад, такія суджэнні: «Секс-рэвалюцыя ў 1920-я: як камуністы разбэшчвалі беларусаў»; «Краіна бардэляў, прастытутак, вольных сексуальных адносін і венерычных хвароб. Такой паўстае Савецкая Беларусь у сваё першае дзесяцігоддзе ў новай кнізе Аляксандра Гужалоўскага...»? Падобныя характарыстыкі, безумоўна, маюць хутчэй рэкламны характар. Аднак, падаграваючы цікавасць шырокага чытача, яны выклікаюць пабочны эфект. Па-першае, амаль на пустым месцы з'яўляецца палеміка, часам агрэсіўная, таму што відавочна: яе ўдзельнікі, мяркуючы па каментарыях, саму кнігу наўрад ці бралі ў рукі. Па-другое, што больш важна, спрашчаецца ўспрыманне самой кнігі. «Сексуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917–1929 гг.» – гэта не проста твор на «пікантную» і не зусім звыклую для айчыннай гістарыяграфіі тэму, а шматаспектная навуковая праца, якая не толькі зацягвае падчас чытання, але і прымушае задумацца ў тым ліку над нашай рэчаіснасцю.

Ужо не першы год выкладаючы курс «Гендарная гісторыя ў кантэксце сусветных цывілізацый», я не магла прапусціць кнігу А. А. Гужалоўскага. Адразу звярну ўвагу на тое, што ўсім, хто жадае знайсці ў выданні эратычныя сцэны ці апісанні тэхнікі сексу, патрэбна звяртацца да іншых крыніц. Па-другое, ніякай пошласці ці расхіствання ўстояў тут таксама няма: аўтар дакладна і стрымана расстаўляе акцэнты ў сваім аповедзе пра аб'ектыўныя падзеі, якія мелі месца ў айчыннай гісторыі. Зразумела, у кнізе ёсць факты, якія нельга назваць прыемнымі для чытача, напрыклад апісанне крымінальных абортаў і самаабортаў (!) ці злачынстваў сексуальнага характару. Аднак ці можна сур'ёзнаму даследчыку ігнараваць матэрыял крыніц, зыходзячы з эмацыянальнага стаўлення паводле прынцыпу «падабаецца – не падабаецца»? Грамадства – гэта сістэма, на існаванне якой кожны элемент ці працэс непасрэдна ці апасродкавана ўплываюць.

Кніга А. А. Гужалоўскага – перш за ўсё праца навуковая. Гэта заўважна нават у будове матэрыялу: у пачатку выдання змешчаны ўводзіны з гістарыяграфічным аглядам і перадгісторыяй праблемы, затым прапануецца аналіз тэарэтычных асноў сексуальнай рэвалюцыі, юрыдычнай і арганізацыйнай базы «новага быту», паказваецца іх канкрэтнае ўвасабленне на мэтавых сацыяльных групах – моладзі і жанчынах. Па-за ўвагай аўтара не засталіся таксама сацыяльныя заганы і сексуальныя дэвіяцыі, уласцівыя любому соцыуму. Падсумоўвае працу заключэнне, у якім распавядаецца пра згортванне «сексуальнай рэвалюцыі» і ўсталяванне маральных узораў савецкага грамадства наступных дзесяцігоддзяў, а таксама змяшчаюцца высновы і ацэнкі аўтара.

На падставе выкарыстання масіву крыніц – мемуарных нататак, перыядычнага друку, архіўных матэрыялаў рознага характару – аўтар рэканструіруе панараму развіцця беларускага грамадства першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя, ствараючы карціну паўсядзённага жыцця і пагружаючы чытача ў атмасферу Савецкай Беларусі 1920-х гг. Гэта падмацоўваецца фатаграфіямі персаналій, дакументаў, афіш, гарадскога і сацыякультурнага асяроддзя, карыкатурамі і малюнкамі з перыядычнага друку, статыстычнымі матэрыяламі. Дадаткова «водар эпохі» надаюць вытрымкі з крыніц на беларускай мове ў тагачаснай арфаграфіі (да рэформы 1933 г.).

У кнізе раскрываюцца тыя бакі беларускай савецкай рэчаіснасці, якія мала закранаюцца ці зусім не асвятляюцца ў традыцыйных працах, прысвечаных сацыяльна-эканамічнаму, палітычнаму і культурнаму развіццю міжваеннай Беларусі. Напрыклад, агульнавядомыя такія паняцці, як «камсамольцы 1920-х гг.» ці «чырвоны студэнт». Але як канкрэтна арганізоўвалася жыццё ў маладзёжных камунах? Колькі моладзі там было і як яна ставілася да такой арганізацыі свайго быту? Што сабой уяўляла камсамольскае каханне тых часоў? Як студэнцтва ставілася да пытанняў сексуальнага жыцця і стварэння сям'і? У якім узросце бралі шлюб і што лічылі вызначальным пры яго заключэнні? Якімі былі жыллёвыя ўмовы асноўнай масы насельніцтва і нормы жылплошчы? Колькі нараджалася дзяцей, якія выкарыстоўваліся сродкі кантрацэпцыі і як рабілі ў той час аборты? Пералік пытанняў можна працягваць. Так, вядома, што пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі жанчына была эмансіпіравана. Але якое стаўленне да гэтага панавала ў гарадскім і сялянскім асяроддзі, сярод мужчын і жанчын? Колькі існавала дзіцячых садкоў, фабрык-кухань, сталовак і іншых устаноў, закліканых вызваліць жанчыну ад хатняй працы? Як у рэальнасці будаваліся адносіны мужчыны і жанчыны пасля абвяшчэння новых ідэйных установак? Якім чынам заключаўся і скасоўваўся шлюб у першае паслярэвалюцыйнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзесяцігоддзе? Якімі сродкамі ажыццяўлялася тагачаснае палавое выхаванне? Нарэшце, для выяўлення маральнага і сацыяльнага стану грамадства не залішне будзе ведаць, наколькі былі распаўсюджаны такія з'явы, як прастытуцыя і злачынствы сексуальнага характару, як з імі змагаліся.

Адзначаныя праблемы, колькасць якіх можа быць значна большай, акрэслены для таго, каб паказаць, што змест кнігі А. А. Гужалоўскага значна больш шырокі і складаны за яе назву. У працы дадзены комплексны зрэз тагачаснага грамадства, шматпрадметны і поўны адценняў. У гэтым сэнсе прыведзеныя ў пачатку рэцэнзіі інтэрнэт-характарыстыкі кнігі выглядаюць занадта спрошчанымі. Камуністы якраз не мелі мэты разбэсціць маладое пакаленне – распуста не толькі не віталася, але і каралася. Іншая справа, што ва ўмовах непісьменнасці і агульнага нізкага культурнага ўзроўню новыя ідэі давалі вынікі, якія камуністы не жадалі ці не маглі прадугледзець. Бардэлі, прастытуткі і венерычныя хваробы, якія, дарэчы, існавалі і ў дарэвалюцыйныя часы, не маглі знікнуць адразу. Гэта малапрыемная рэальнасць тагачасных беларускіх зямель, якая стала яшчэ больш складанай ва ўмовах Першай сусветнай вайны.

Аўтар здолеў не толькі стварыць партрэт грамадства канкрэтнай эпохі, але і паказаць у разнастайных праявах маштабную змену гендарных роляў і разбурэнне традыцыйнай сям'і ў першае савецкае дзесяцігоддзе, раскрыўшы практычна ўсе аспекты гэтых працэсаў – ад іх тэарэтычнага абгрунтавання тагачаснымі ідэолагамі да непрадказальных наступстваў у псіхалагічнай, дэмаграфічнай, крымінальнай, медыцынскай сферах.

Сексуальная рэвалюцыя і гендарная трансфармацыя 1920-х гг. – гэта не толькі выбітны і ўнікальны ў айчыннай гісторыі сацыяльны эксперымент. Гэта працэс неадназначнага і нават пакутнага станаўлення такой гістарычнай постаці, як савецкая жанчына, і ён прасочаны А. А. Гужалоўскім. Менавіта пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі быў абвешчаны «кантракт працуючай маці» – трайная нагрузка, што складалася з нараджэння і выхавання дзяцей, вядзення хатняй гаспадаркі і абавязковай працы – і ён захаваўся да канца існавання СССР. Яшчэ чакае свайго даследчыка поўная гераізму, горычы і болю гісторыя таго, што перажылі савецкія жанчыны падчас Вялікай Айчыннай вайны, акупацыі і першых пасляваенных дзесяцігоддзяў. Шырокавядомай у свой час была і такая «народная» характарыстыка савецкай жанчыны: «У адной руцэ – сетка, у другой – Светка, наперадзе – пяцігадовы план, а ззаду – п'яны Іван».

Кніга А. А. Гужаўлоўскага не можа пакінуць чытача раўнадушным, таму пажаданні і заўвагі падаюцца натуральнымі. Так, ракурс успрымання асноўнага матэрыялу працы толькі б выйграў, калі б аўтар пашырыў агульнаеўрапейскі кантэкст разглядаемых праблем. Працэсы, якія мелі месца на беларускіх землях, не былі чымсьці мясцовым. І калі аўтар выкарыстаў для стварэння фону ўводзін працу Э. Фукса аб галантным стагоддзі, то, напэўна, кніга гэтага ж аўтара «Гісторыя нораваў» дазволіла б стварыць больш маштабную панараму.

З другога боку, і ўласна беларуская тэматыка выглядала б больш насычанай і карыснай для чытача ў пазнавальным плане, калі б на старонках кнігі знайшлося месца для жанчын, постаці якіх з'яўляюцца яскравым увасабленнем тых сацыякультурных і гендарных змен, якія папярэднічалі сексуальнай рэвалюцыі 1920-х гг. Пэўныя персаналіі ў працы згадваюцца, аднак чамусьці сярод іх няма ўраджэнкі тагачаснай Віцебскай губерні, стваральніцы партыі эсэраў і яе баявой арганізацыі, «бабулі рускай рэвалюцыі» Кацярыны Брэшка-Брашкоўскай; паэтэсы і дзеяча беларускага нацыянальнага адраджэння Алаізы Пашкевіч (Цёткі); вядомага мецэната княгіні Марыі Магдалены Радзівіл... Лёс Элізы Ажэшка, якая не толькі была пісьменніцай, але фактычна выступала ідэолагам жаночага руху і ўсё жыццё пражыла ў Гродне, норавы якога апісала ў сваіх творах, наогул сімвалічны для эпохі станаўлення жаночай эмансіпацыі. Што ж да Саламеі Русецкай, то зварот да яе твора «Авантуры майго жыцця» мог даць матэрыял куды больш багаты для разумення сямейна-шлюбных адносін XVIII ст., чым проста спасылка на, безумоўна, знакавую працу А. Мальдзіса аб жыцці нашых продкаў у тую эпоху. Беглы агляд лёсаў гэтых жанчын – матэрыял, для якога не спатрэбілася б вельмі шмат месца ў фармаце ўводзін.

Прэзентацыя кнігі і размова падчас яе з аўтарам паказала, што пэўная частка матэрыялу пакінута за межамі кнігі, таму можна пажадаць А. А. Гужалоўскаму другога, больш поўнага выдання працы. Магчыма паставіць і такія пытанні, што не закраналіся ў даследаванні: наколькі ўплывалі апісаныя ў кнізе працэсы на становішча ў Заходняй Беларусі, і, наадварот, як там ацэньвалася і каментавалася тое, што ажыццяўляла савецкая ўлада?

Праца А. А. Гужалоўскага – кніга не толькі аб працэсах і падзеях, але і аб людзях. Іх шмат, і, напэўна, пра некаторых ужо наспеў час пісаць асобна. Яскравы таму прыклад – постаць беларускай «валькірыі рэвалюцыі» Соф'і Шамардзіной. Фрагментарныя інтэрнэт-звесткі пра гэту ўнікальную жанчыну не могуць быць параўнаны нават з двума дзясяткамі старонак у кнізе А. А. Гужалоўскага. Несумненна, асобная праца, прысвечаная лёсу гэтай жанчыны ў кантэксце эпохі, створаная на багатым архіўным матэрыяле, не пакіне абыякавымі тых, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй – як гендарнай, так і палітычнай. Падаецца, што мена-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

віта А. А. Гужалоўскі, у распараджэнні якога знаходзіцца вялікі і ўжо добра знаёмы даследчыку масіў архіўнага матэрыялу, дапоўнены дасканалым веданнем эпохі міжваеннай Беларусі, мог бы напісаць такую кнігу. Трэба адзначыць, што Соф'я Шамардзіна была сучасніцай расійскай «валькірыі рэвалюцыі» – Ларысы Рэйснер, жыццё якой абарвалося рана – у трыццаць гадоў. Можна толькі здагадвацца аб тым, якім мог быць лёс Л. Рэйснер, калі б яна дажыла да васьмідзесяціпяцігадовага ўзросту, як Шамардзіна. Тым не меньш аб Л. Рэйснер існуе самастойнае даследаванне Г. Пржыбароўскай, выдадзенае ў серыі «ЖЗЛ».

«Есть у революции начало, нет у революции конца», – напэўна, амаль кожны, чалавек, які жыў у СССР, знаёмы з гэтымі радкамі папулярнай у савецкія часы песні. Можна разважаць ці спрачацца аб іх актуальнасці ў адносінах да Кастрычніцкай рэвалюцыі, тым больш што яе стагадовы юбілей дае для гэтага нагоду. У дачыненні ж да сексуальнай рэвалюцыі наўрад ці можна знайсці больш удалы лозунг. Пры гэтым ні ў якім разе нельга весці гаворку аб нейкім прыніжэнні кастрычніцкіх падзей праз такое параўнанне. Адносіны палоў, стварэнне сям'і, нараджэнне дзяцей, дасягненне дэмаграфічнай бяспекі і пэўнага гендарнага балансу – гэта фундамент для развіцця любога соцыуму, гвалтоўная перабудова ці наогул разбурэнне якога заўсёды прыводзіць да негатыўных наступстваў. Невыпадкова па гэтай прычыне маятнік сексуальнай рэвалюцыі заўсёды вагаецца, а адпаведныя працэсы ўнутры грамадства ніколі не перапыняюцца.

Савецкае грамадства 1920-х гг. адчула на сабе вынікі ўведзеных «зверху» інавацый у галіне шлюбу і сям'і да такой ступені, што, таксама распараджэннем «зверху», сексуальная рэвалюцыя была згорнута. У перыяд перабудовы, распаду СССР і станаўлення постсавецкага грамадства адбылася яшчэ адна сексуальная рэвалюцыя ў межах былой савецкай прасторы. Па сутнасці, яна працягваецца і цяпер. Аднак, у адрозненне ад падобных працэсаў стагадовай даўніны, цяпер ідзе гаворка не толькі пра радыкальнае змяненне інстытута сям'і, але і пра страту гендарнай ідэнтычнасці, што пагражае значна больш сур'ёзнымі негатыўнымі наступствамі. Дадзены аспект дапаўняецца ўзмацненнем традыцыйнай мадэлі гендарных адносін, новым узроўнем узаемных патрабаванняў палоў, наступствамі ў выхаванні дзяцей, асабліва хлопчыкаў, у няпоўных сем'ях... Такая наша сённяшняя рэальнасць, і лёс кожнага з нас – яе частка і вынік. У сувязі з гэтым кніга А. А. Гужалоўскага падаецца яшчэ больш запатрабаванай. Яна выклікае ў чытача роздум аб гістарычных паралелях, выспяванне ўласнага стаўлення і цікавасці да айчыннай гісторыі, разважанне аб лёсе продкаў і сучаснасці, усведамленне ўласнай уключанасці ў канву жыцця.

Нарэшце, спалучэнне вартасцей навуковай працы з цікавым гістарычным наратывам, тэарэтычных высноў з унікальнымі фактамі, часам на мяжы кур'ёзаў, навізна погляду на падзеі, якія здаваліся знаёмымі – усё гэта ўласціва кнізе А. А. Гужалоўскага, якая, несумненна, з'яўляецца неардынарнай і яскравай працай у айчыннай гістарыяграфіі.

*Л. У. Ландзіна*,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР